## Сённяшні нумар мы прысвячаем Першамаю і 150-годдзю з дня нараджэння Карла Маркса

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

№ 16 (707) ● Пятніца 26 красавіка 1968 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XXI




# ВУЧЭННЕ МАРКСА ЎСЕМАГУТНА, ТАМУ ШТО ЯНО ПРАВІЛЬНА

*У. І. Ленін*

Бадай кожнаму савецкаму чалавеку ўжо са школьнай парты міжволі запомніліся словы: «У навуцы няма шырокай сталбавой дарогі, і толькі той зможа дасягнуць яе ззяючых вяршынь, хто не баючыся цяжкасцей, карабкаецца па яе камяністых сцежках». У гэтых словах Карла Маркса заключана не толькі вялікая мудрасць, у іх — адлюстраванне выніку працяглага, напружанага і плённага пошуку заснавальніка навуковага камунізма, адказаў на шматлікія пытанні цэлай эпохі.

Бурлівыя палітычныя падзеі сярэдзіны XIX стагоддзя ў першую чаргу патрабавалі адказу на пытанне, куды ідзе чалавецтва, які лёс чакае буржуазнае грамадства. Глыбока вывучаючы капіталістычны лад, яго супярэчнасці, абагульняючы навуковыя дасягненні мінулых вякоў, а таксама вопыт класавай барацьбы працоўных, Карл Маркс прыйшоў да вываду, што прававыя адносіны, як і формы дзяржавы, «караняцца ў матэрыяльных жыццёвых адносінах», што «анатамію грамадзянскага грамадства патрэбна шукаць у палітычнай эканоміі». Вывучэнню палітэканоміі К. Маркс аддаў многа сіл і часу. Ён прыйшоў да пераканання, што рабочы клас, які падняўся на гістарычную арэну, не можа ўзяць на ўзбраенне буржуазную палітэканомію, таму што яна служыць капіталістам, замацоўвае буржуазныя адносіны. Карл Маркс сарваў прадметную абалонку і стварыў палітычную эканомію рабочага класа — вышэйшае дасягненне ў гэтай галіне навуковых ведаў.

Марксісцкая палітычная эканомія стала тэарэтычным выражэннем каранных інтарэсаў рабочага класа, стала магутнай ідэйнай зброяй працоўных у барацьбе за знішчэнне эксплуатацыі і прытнёту, за камуністычнае грамадства. І гэта не выпадкова. Калі ўзмоцненая эксплуатацыя рабочых прымусіла іх пачаць узброеную барацьбу супроць буржуазіі, пытанне аб ролі і перспектывах гэтай барацьбы мела далёка не акадэмічны сэнс. Неабходна было з навуковай праўдзівасцю даказаць магчымасць і непазбежнасць крушэння капіталізма, наяўнасць у

(Працяг на 2-й стар.).

**Вось ужо на працягу больш ста год гістарычнае развіццё ідзе па шляху, прадсказанаму марксісцкай тэорыяй. З кожным паваротам гісторыі марксізм атрымлівае ўсё новыя і новыя перамогі.**

**Праўда жыцця на баку марксізма, ён і надалей будзе атрымліваць перамогі, набліжаючы час поўнай перамогі камунізма на нашай планеце.**

*(З Тэзісаў Інстытута марксізма-ленінізма пры ЦК КПСС да 150-годдзя з дня нараджэння Карла Маркса).*

# ПОСТУП ВЯЛІКАГА СВЯТА

**Першамай. Ён заўсёды прыходзіць з сонцам, з птушыным спевам, са звонкімі вяснянкамі. У ім радасць абуджэння зямлі, радасць нараджэння — усеабдымная чалавечая радасць. Гімн сонцу, гімн жыццю спявае ў паднябессі жаўрук, бруяцца званчэй крыштальныя крыніцы, вольна цякуць раскутыя рэкі... Усё гэта Першамай!**

**Святам шчасця і маладосці прыходзіць 1 Мая на нашу савецкую зямлю. Для нас яно пачынаецца ўрачыстымі пазыўнымі сталіцы Радзімы — Масквы. Як весні гром, прагрымяць артылерыйскія салюты... У гонар нашых перамог, у гонар савецкага чалавека!.. На вуліцы гарадоў і вёсак краіны выйдуць мільёны працоўных. Яны велічна пранясуць рапарты працоўных дасягненняў, прадэманструюць сваю любоў і адданасць Камуністычнай партыі, роднай дзяржаве, вернасць ідэям Вялікага Кастрычніка.**

**У калонах дэманстрантаў разам з будаўнікамі і рабочымі, настаўнікамі і ўрачамі, дзеячамі навукі і культуры пройдзе шматтысячная армія студэнтаў і аспірантаў, кандыдатаў і дактароў навук нашага БДУ—буйнейшай навучальнай установы рэспублікі, старэйшай кузні навуковых кадраў. Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту імя У. І. Леніна ёсць аб чым рапартаваць Радзіме. За гады свайго існавання ён падрыхтаваў звыш 22 тысяч высокакваліфікаваных спецыялістаў. Звыш 4 тысяч манаграфій і 14 тысяч даследаванняў — гэта плён яго вучоных. Ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга — гэта заслужаная адзнака яго поспехаў.**

**Сёння універсітэт у росквіце сіл. Кожны год у яго аўдыторыі ўваходзіць каля двух тысяч першакурснікаў. Вялікай інтэрнацыянальнай сям'ёй жывуць нашы студэнты. Разам з беларусамі і рускімі, літоўцамі і грузінамі кожную раніцу універсітэцкія дзверы адчыняюць юнакі і дзяўчаты з В'етнама, Кубы, краін Афрыкі і Азіі.**

**Спецыялістаў з БДУ вы сустрэнеце ўсюды. Гэта фізікі і матэматыкі, юрысты і філолагі, журналісты і біёлагі, географы і гісторыкі, хімікі і філосафы. У розных кутках Радзімы яны з гонарам нясуць сцяг перадавой савецкай навукі. Штогод ва універсітэце адкрываюцца новыя аддзяленні, кафедры, лабараторыі. У будоўлі, у новым росквіце універсітэцкі гарадок. І ажно не верыцца, што нейкіх дваццаць гадоў назад ён ляжаў, як і ўся беларуская сталіца, у папялішчах і руінах. Колькі энергіі, колькі мужнасці трэба было, каб зрабіць яго універсітэтам-прыгажуном, са светлымі аўдыторыямі, сучаснымі лабараторыямі, з велічнымі будынкамі-гмахамі...**

**Першамай... Пара абуджэння, пара цвіцення. Выйдзі ў поле, прайдзіся лесам — і ты адчуеш, убачыш, як ажывае прырода. Густой зялёнай шчоткай ляжаць жытнёвыя палеткі, падаюць зярняты ў раллю... Быццам захмялелыя ад водару, заліваюцца на ўсе лады птушкі.**

**Усё гэта неаддзельна ад урачыстага свята 1 Мая. Багатае і шчодрае яно прыходзіць у кожны студэнцкі пакой, у кабінет вучонага, заглядае ў кожную студэнцкую аўдыторыю.**

**Шчасця і поспеху, дарагія сябры! З Першамаем!**

## БДУ у гэтыя дні

ГАСЦІННА расчыніліся дзверы нашага універсітэта перад нямецкімі сябрамі. Група студэнтаў Іенскага універсітэта прыехала на азнаямленча-вытворчую практыку і разам з намі адзначыць першамайскае свята і юбілей Карла Маркса.

*ЗАЎТРА ў актавай зале галоўнага корпуса адбудзецца вялікі першамайскі святочны вечар. У канцэрце прымуць удзел любімыя студэнтамі калектывы—танцавальны і эстрадны, народны аркестр народных інструментаў і народная харавая капэла.*

**ТУРЫСТЫ** фізічнага факультэта правядуць святочныя дні ў шлюпачным паходзе па рацэ Сож. Па маршруту яны наведаюць месцы баявой і рэвалюцыйнай славы, сустрэнуцца з працаўнікамі гарадоў і сёл.

АРТЫСТЫ студэнцкага самадзейнага тэатра універсітэта па праву ганарацца сваёй пастаноўкай «Маладой гвардыі». Спектакль вельмі спадабаўся гледачам.

Вось чаму тэатр вырашыў паказаць яго працаўнікам саўгаса «Заслаўль» напярэдадні 1 Мая.

ЗАПАС бадзёрасці і сілы папоўняць многія студэнты напярэдадні экзаменацыйнай сесіі ў дамах адпачынку «Беларусь», «Нарач», «Ждановічы», на курортах Крыма, Каўказа і Прыбалтыкі. Пуцёўкі для іх загадзя падрыхтаваў прафсаюзны камітэт універсітэта.

# ПЕРАМОЖНАЕ ШЭСЦЕ



**Наша родная Беларусь была ў ліку першых раёнаў Расіі, у якіх ужо ў сярэдзіне XIX стагоддзя сталі распаўсюджвацца творы Карла Маркса. Праз Варшаву, Пецярбург і іншыя гарады сюды завозяцца брашуры, рэвалюцыйныя пракламацыі, газеты з артыкуламі заснавальніка навуковага камунізма.**

**29 красавіка 1875 года міністр унутраных спраў, а затым папячыцель Віленскай вучэбнай акругі паведамлялі, што ў агульнаадукацыйных гуртках Мінскай і Слуцкай гімназій, а таксама Пінскага рэальнага вучылішча вялікай папулярнасцю карыстаюцца марксісцкія творы. Цяпер стала вядома, што ў 1881 годзе сярод рэвалюцыйнай інтэлігенцыі Гродна распаўсюджваўся «Маніфест Камуністычнай партыі» на польскай мове, кніга К. Маркса «Грамадзянская вайна ў Францыі». Некалькі пазней гэтыя творы сталі вядомы рэвалюцыйнаму падполлю Мінска і іншых гарадоў.**

**У 80-ых гадах Мінск і Вільня становяцца буйнейшымі цэнтрамі тайнай перавозкі марксісцкай літаратуры праз граніцу ў Расію. Іменна праз гэтыя гарады ў розныя куткі Беларусі ідуць выданні групы «Вызвалення працы». Сярод іх работы К. Маркса і Ф. Энгельса «Маніфест Камуністычнай партыі», «Убогасць філасофіі», «Наёмная праца і капітал», Г. В. Пляханава «Сацыялізм і палітычная барацьба» і іншыя. Удзельнік студэнцкага рэвалюцыйнага гуртка ў Пецярбургу беларускі паэт Адам Гурыновіч паказваў следству, што ён чытаў забароненыя кнігі, у тым ліку і «Капітал» К. Маркса. Дарэчы, «Капітал» у 1886 годзе прадаваўся ў кніжным магазіне Мінска. Аб гэтым паведамляла газета «Минский листок».**

**Новы этап распаўсюджання твораў Маркса на Беларусі пачынаецца ў сувязі з развіццём масавага рэвалюцыйнага руху рабочых.**

**У 1900—1917 гадах тут працавалі такія вядомыя рэвалюцыянеры, як І. В. Бабушкін, Ф. Э. Дзяржынскі, П. М. Лепяшынскі, В. Н. Залежскі, М. В. Фрунзе, А. Ф. Мяснікоў. Палымяныя прапагандысты марксізма, яны шмат зрабілі для таго, каб данесці ідэі навуковага камунізма да працоўных Беларусі. Гэтаму садзейнічала выданне і распаўсюджанне твораў У. І. Леніна — вялікага прадаўжальніка справы К. Маркса і Ф. Энгельса. Ленінскія творы, праграмныя рашэнні РСДРП, першы з'езд якой адбыўся ў Мінску, натхнялі рабочых і сялян на барацьбу за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне, за перамогу сацыялістычнай рэвалюцыі.**

**Пераможнае шэсце твораў Карла Маркса, марксісцкай літаратуры па Беларусі яшчэ да Вялікага Кастрычніка сведчыць аб тым, што працоўныя ўбачылі ў гэтых творах магутную зброю ў барацьбе за свае правы, знаходзілі ў іх адказы на самыя хвалюючыя і злабадзённыя пытанні. Яны не памыліліся ў сваім выбары. Пад кіраўніцтвам ленінскай партыі працоўныя краіны, у тым ліку і беларускія рабочыя і сяляне, ажыццявілі і ажыццяўляюць тое, аб чым марыў, чаму прысвяціў усё сваё жыццё Карл Маркс.**

## НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

*7—8 мая ў галоўным корпусе універсітэта адбудзецца навуковая канферэнцыя, прысвечаная 150-годдзю з дня нараджэння К. Маркса. Будуць прачытаны даклады:*

*К. Маркс — заснавальнік навуковага камунізма (дакладчык — дацэнт А. М. Паўлючэнка).*

*К. Маркс і рэвалюцыйная партыя рабочага класа (прафесар У. М. Сікорскі).*

*К. Маркс — стваральнік навуковай палітычнай эканоміі (дацэнт С. Я. Янчанка).*

*К. Маркс як філасаф (доктар філасофскіх навук Р. А. Левін).*

*К. Маркс аб становішчы асобы пры капіталізме (прафесар В. І. Сцяпанаў).*

*К. Маркс і рэвалюцыйная Расія (прафесар І. М. Лушчыцкі).*

*К. Маркс і сусветны рэвалюцыйны працэс (дацэнт М. Р. Круцько).*

# ВУЧЭННЕ МАРКСА ЎСЕМАГУТНА, ТАМУ ШТО ЯНО ПРАВІЛЬНА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

ім эканамічных прадпасылак новага грамадства — без сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту, інакш «усе спробы ўзрыву былі б донкіхоцтвам» (Маркс). На гэтае карэннае пытанне і дала глыбокі навуковы адказ марксісцкая палітычная эканомія і перш за ўсё сам Карл Маркс.

К. Маркс адкрыў прыбавачную вартасць, даказаў, што яна — вынік неаплачанай працы наёмных рабочых, крыніца ўзбагачэння буржуазіі. Па вобразнаму выказванню паэта, ён «грабячых прыбавачную вартасць злавіў на месцы злачынства». Падобна да таго, як у далёкія часы адкрыццё агню ўзвысіла чалавека над даўчымі яго сіламі прыроды, дало яму ў рукі магутную зброю, каб парваць яму з жывёльным становішчам, так і адкрыццё прыбавачнай вартасці вырвала рабочы клас са становішча наёмнага рабства, дало яму ў рукі магутную, нічым не замяняемую духоўную зброю для згуртавання і мабілізацыі сваіх сіл. Карл Маркс даказаў, што пралетарыят можа і павінен узяць у агульную ўласнасць тое, што створана яго працай і што прысвойваецца капіталістамі. «Экспрапрыяцыя экспрапрыятараў» — вось вывад Карла Маркса і разам з тым прызыўны заклік класа, які ідзе да свайго палітычнага панавання — дыктатуры пралетарыята.

Карл Маркс, раскрываючы анатомію капіталізма, прасачджваў развіццё ў нетрах старога ладу сіл новага будучага грамадства. Ён зрабіў геніяльныя вывады аб неабходнасці сацыялістычнай рэвалюцыі, пераходнага перыяду ад капіталізма да камунізма, аб двух фазах камуністычнага грамадства. Нельга ў невялікім артыкуле нават пералічыць усе важнейшыя палажэнні марксізма па пытаннях грамадства і чалавечай гісторыі. Яго вывады, вернасць яго тэорыі падцверджаны ўжо не толькі вопытам сацыялістычнага і камуністычнага будаўніцтва ў СССР, але і ў іншых краінах, вопытам развіцця міжнароднага рабочага і нацыянальна-вызваленчага руху.

Баявы паплечнік і памочнік Карла Маркса Фрыдрых Энгельс гаварыў, што і імя і справы яго перажывуць стагоддзі. Сапраўды, імя Маркса вядома цяпер у самых аддаленых кутках розных краін і кантынентаў, пад сцягам марксізма змагаюцца за сваю свабоду і шчасце працоўныя ўсяго свету. Ідэолагам буржуазіі, апартуністам, рэвізіяністам не ўдалося і не ўдасца даказаць, што вучэнне Карла Маркса было правільным толькі для свайго часу. К. Маркс сам лічыў, што яго тэорыя не догма, што яна павінна развівацца ў сувязі з запатрабаваннямі самога жыцця.

Вялікім прадаўжальнікам справы Маркса-Энгельса з'яўляецца У. І. Ленін. Ён узняў на новую вышыню ўсе састаўныя часткі марксізма, узбагаціў яго новымі вывадамі і палажэннямі. У. І. Ленін быў першым чалавекам, пад кіраўніцтвам якога стала ажыццяўляцца тэорыя навуковага камунізма. Створаная ім партыя павяла працоўных да новых поспехаў у рэвалюцыйнай перабудове грамадства. Цяпер сацыялістычны лагер, міжнародны камуністычны рух сталі рашаючай сілай гістарычных працэсаў. І чым больш аддаляецца чалавецтва ад тых часоў, калі жыў і працаваў Карл Маркс, тым ярчэй акрэсліваецца веліч яго неўміручых ідэй. Па-ранейшаму марксізм-ленінізм на пярэднім краі барацьбы за прагрэс.

**С. ЯНЧАНКА,**
**загадчык кафедры палітэканоміі, кандыдат эканамічных навук.**

# БЕЛАРУСКІ КАРЭСПАНДЭНТ МАРКСА

**У выдавецтве «Беларусь» выходзіць у свет кніга нядаўняга выпускніка нашай аспірантуры І. П. Шпадарука «Змагары за народную справу» — аб жыцці і дзейнасці членаў Рускай секцыі І Інтэрнацыянала. Іван Паўлавіч у студзені гэтага года абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму: «Сацыялагічныя пазіцыі Рускай секцыі І Інтэрнацыянала» і цяпер працуе старшым выкладчыкам Мінскай Вышэйшай партыйнай школы. Ніжэй мы змяшчаем падрыхтаваны ім для нашай газеты артыкул пра беларускага рэвалюцыянера А. Д. Трусава — карэспандэнта Карла Маркса.**



*На здымку фотакопія пісьма А. Д. Трусава І. Ф. Беккеру — сябру Карла Маркса.*

«Грамадзяніну Марксу А. Трусаў, рэдакцыя «Народнага дела»

Дарагі і высокашаноўны грамадзянін!

Ад імя групы рускіх мы звяртаемся да Вас з просьбай аказаць нам гонар быць нашым прадстаўніком у Генеральным Савеце Міжнароднага Таварыства ў Лондане. Гэтая група рускіх толькі што стварыла секцыю Інтэрнацыянала, таму што вялікая ідэя гэтага міжнароднага руху пралетарыята пранікае таксама і ў Расію...»

Гэтыя радкі належаць сакратару Рускай секцыі І Інтэрнацыянала беларускаму рэвалюцыянеру Антону Данілавічу Трусаву. Ён нарадзіўся 15 мая 1835 года. Бацька яго — Даніла Іванавіч служыў у пачтовай канторы Мінска. У 1853 годзе Антон Данілавіч закончыў Мінскую гімназію, а ў 1854 годзе — залічан у Маскоўскі універсітэт на медыцынскі факультэт. У час вучобы ва універсітэце А. Трусаў зблізіўся з рэвалюцыйна накіраванай моладдзю і далучыўся да тайных гурткоў «Маладая Расія», польскага «Опулу». А калі ўспыхнуў вызваленчы рух 1863 года, ён узначаліў паўстанцкі атрад і змагаўся супроць царскіх войск на тэрыторыі Мінскай губерні.

Пасля падаўлення паўстання 1863 года беларускі рэвалюцыянер эмігрыраваў у Францыю, затым пераехаў у Жэневу і стаў загадваць рэвалюцыйнай друкарняй часопіса «Народное дело». Адначасова А. Трусаў быў выбран сакратаром Рускай секцыі І Інтэрнацыянала. Кіраўніком жа секцыі з'яўляўся Н. І. Уцін, а яе членамі — Е. Л. Дзмітрыева, Е. Г. Барценева і А. В. Корвін-Крукоўская. Усе яны абаранялі праграму і статут І Інтэрнацыянала пад непасрэдным кіраўніцтвам К. Маркса і Ф. Энгельса.

Рускія дзеячы Міжнароднага Таварыства Рабочых і іх друкаваны орган часопіс «Народное дело» салідарызаваліся з вучэннем К. Маркса. Так, яны пісалі правадыру: «Руская дэмакратычная моладзь выказвае Вам сваю глыбокую ўдзячнасць за тую дапамогу, якую Вы аказвалі нашай справе Вашай тэарэтычнай прапагандай».

Члены Рускай секцыі ўспрынялі элементы дыялектыкі і лічылі галоўным — яе баявую рэвалюцыйную сутнасць. Іменна дзякуючы дыялектычнай ідэі развіцця ў прыродзе і грамадстве народавольцы прыйшлі да вываду аб мінучым характары прыгоннага ладу ў Расіі і неабходнасці сацыяльнай рэвалюцыі для ўстанаўлення больш справядлівага грамадскага ладу.

Пасля спынення дзейнасці Рускай секцыі І Інтэрнацыянала яе сакратар А. Трусаў працягваў заставацца ў Жэневе, абараняючы марксізм ад нападкаў ворагаў. З пісьма К. Маркса да Ф. Энгельса ад 9 верасня 1873 года мы ведаем, што беларускі рэвалюцыянер дапамог яму выкрыць аўтара анархісцкай брашуры. У 1882 годзе, даведаўшыся аб нападках на К. Маркса ліберальна-палітычнай рускай эмігранцкай газеты «Общее дело», А. Трусаў рэкамендуе яе рэдактару «звярнуць увагу на тое месца, дзе гаварылася пра Маркса», і дае параду «прачытаць «Камуністычны Маніфест», каб «пераканацца ў прошлеглым поглядзе» на ўсёпераможнае вучэнне Маркса.

Вучань і памочнік К. Маркса і Ф. Энгельса прыняў таксама актыўны ўдзел у стачачным руху Францыі і Швейцарыі. Пралетарскі інтэрнацыяналізм членаў Рускай секцыі асабліва праявіўся ў дні Парыжскай Камуны. Е. Дзмітрыева і А. Корвін-Крукоўская са зброяй у руках абаранялі першую ў свеце пралетарскую дзяржаву, а кіраўнікі секцыі Н. Уцін і А. Трусаў увайшлі ў склад тайнага Жэнеўскага камітэта па аказанню дапамогі Камуне.

Вельмі важным для рэвалюцыйнай прапаганды ў Расіі з'явілася выданне ў друкарні і часопісе «Народное дело» пісем і работ К. Маркса і Ф. Энгельса, якія распаўсюджваліся ў многіх кутках краіны.

Напружаная рэвалюцыйная праца прывяла да таго, што А. Трусаў моцна захварэў. У 1883 годзе, калі арганізоўвалася марксісцкая група «Вызваленне працы», беларускі рэвалюцыянер перадаў ёй сваю друкарню «Народное дело». Прыкладна праз год А. Трусава, ужо цяжка хворага, прывезла ў Мінск яго сястра, дзе ён у хуткім часе і памёр.

Члены Рускай секцыі, сакратаром якой быў А. Трусаў, фактычна першымі з рускіх рэвалюцыянераў таго часу пад уздзеяннем К. Маркса і Ф. Энгельса вылучылі ідэю стварэння ў нашай краіне рабочых саюзаў і партыі, многае зрабілі ў распаўсюджанні вучэння марксізма. Вось чаму Фрыдрых Энгельс гаварыў аб вучнях і памочніках К. Маркса па І Інтэрнацыяналу, што сярод іх «ёсць людзі, якія па сваіх дараваннях і характары, безумоўна, належаць да лепшых людзей нашай партыі; хлопцы, у якіх вытрымка, цвёрдасць характару і ў той жа час тэарэтычнае разуменне проста незвычайныя».

*І. ШПАДАРУК.*




*Юнакі і дзяўчаты! Настойліва авалодвайце марксіс-цка-ленінскай тэорыяй, вышынямі сучаснай навукі і тэхнікі! Будзьце актыўнымі будаўнікамі камуністычнага грамадства! Працягвайце рэвалюцыйныя традыцыі Вялікага Кастрычніка!* (З ЗАКЛІКАЎ ЦК КПСС ДА 1 МАЯ 1968 ГОДА.)

У выпускнікоў-завочнікаў факультэта журналістыкі цяпер гарачая пара—абарона дыпломных работ. Многія з іх атрымліваюць добрыя і выдатныя адзнакі. На добра ацэнена і работа студэнткі Н. Гнеўка па тэме «Рэвалюцыйная байка Д. Беднага ў газетах «Звезда» і «Правда», 1912—1914 гг.».

**На здымку: Н. Гнеўка** ў час абароны дыпломнай.

Фота **І. Аскіркі.**



## БУДЗЬЦЕ БАЛЕЛЬШЧЫКАМІ

*Даўно ўжо сталі традыцыйнымі конкурсы-агляды насценнага друку. Залішне гаварыць аб іх карысці. Падзяліцца вопытам, узяць лепшае, пазнаёміцца з поспехамі факультэтаў, з іх надзённымі клопатамі і праблемамі — гэта галоўнае ў задуманым.*

*Сёлета агляд-конкурс праводзіцца ў два туры, пад дэвізам дастойнай сустрэчы 50-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі. Днямі журы конкурса падвядзе вынікі першага тура. На чацвёртым паверсе галоўнага корпуса вывешаны на агляд газеты усіх факультэтаў. Сярод іх «Слова філолага» і «Vita», якія ў мінулым годзе ў конкурсе падзялілі першае месца, і зусім маладая газета новага факультэта «Журналіст», «Мерыдыян», «Хімік» і іншыя.*

*Таварышы, калі вы яшчэ не паспелі пазнаёміцца з газетамі — удзельніцамі конкурсу, абавязкова загляніце на чацвёрты паверх. Вы даведаецеся, чым жывуць фізікі і геолагі, матэматыкі і юрысты, як яны робяць сваю газету. Будзьце балельшчыкамі!*

## МАЦНЕЦЬ НАШЫМ СУВЯЗЯМ

Рэктарат, партыйны камітэт, праўленне універсітэцкай арганізацыі таварыства «Веды» напярэдадні Першамая атрымалі шмат пісем ад калектываў прадпрыемстваў, калгасаў і вайсковых падраздзяленняў, у якіх выказваецца шчырая ўдзячнасць лектарам. Аб адной з такіх падзяк хацелася б сказаць асобна. Яе прыслаў сакратар партыйнага камітэта Мінскага ордэна Леніна аўтамабільнага завода.

Партком адзначае, што на працягу многіх год прафесары і выкладчыкі універсітэта прымаюць актыўны ўдзел у прапагандзе навуковых ведаў, тлумачэнні рашэнняў партыі і ўрада сярод многатысячнага слаўнага калектыва аўтамабілебудаўнікоў. Гэта дапамагае паспяхова весці работу па павышэнню палітычнага і агульнаадукацыйнага ўзроўню працаўнікоў. Як самых дарагіх гасцей, тут сустракаюць супрацоўнікаў кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў (загадчык — прафесар У. М. Сікорскі), кафедры навуковага камунізма (дацэнт М. Р. Круцько), прафесара Л. І. Фіглоўскую, кандыдатаў навук В. А. Захараву, Г. Я. Галенчанку, З. С. Мелкіх, Н. М. Рамашка, Л. Л. Кароткую, У. С. Карабана і многіх іншых. У пісьме выказваецца ўдзячнасць старшыні арганізацыі таварыства «Веды» дацэнту Мацвею Якаўлевічу Рэзнікаву, які многа дапамагае ў арганізацыі лекцыйнай работы на заводзе.

У заключэнне партком выказвае ўпэўненасць, што цесная сувязь з калектывам буйнейшага цэнтра навукі — Белдзяржуніверсітэтам будзе мацнець і развівацца. І трэба сказаць, што так яно і ёсць.

## ВЯСНА САЛІДАРНАСЦІ Ў В'ЕТНАМЕ

**Разам з працоўнымі ўсяго свету Дзень салідарнасці рабочых адзначыць і мой народ. 1 Мая ў В'етнаме — цёплы летні дзень. Ярка свеціць сонца, пышна зелянеюць дрэвы, радуюць вока духмяныя кветкі. Наогул, усюды вельмі прыгожа. Сёлета в'етнамцы выйдуць на святочныя дэманстрацыі з лозунгамі, у якіх будуць гучаць патрабаванні спыніць агрэсію амерыканскіх імперыялістаў. Працоўныя скажуць аб сваёй рашучасці ў што б ні стала дабіцца перамогі. Разам з гэтымі словамі на плакатах і транспарантах будуць адлюстраваны рапарты вытворчых поспехаў, якія, трэба сказаць, дасягнуты ў асабліва складаных і цяжкіх умовах. Усім вядома, што амерыканскія самалёты па-ранейшаму бамбяць гарады і сёлы В'етнама, сеюць смерць сярод мірнага насельніцтва.**

**Мы вучымся ў Савецкім Саюзе, далёка ад сваёй Радзімы, але заўсёды думаем аб ёй, вучымся для яе, з дапамогай савецкіх сяброў авалодваем ведамі, каб пасля найбольш поўна выкарыстаць іх.**

**Нібы жывыя, перад вачыма праходзяць незабыўныя карціны першамайскага В'етнама. Вуліцы запоўнены па-святочнаму адзетымі людзьмі, у руках ва ўсіх кветкі, а на вуснах — радасныя ўсмешкі. Было і такое, што свята перарывалася амерыканскімі агрэсарамі. Але, як толькі атакі ворага былі адбіты, людзі зноў працягвалі традыцыйныя шэсці.**

**Гераічны В'етнам змагаецца. Ён пераможа. Залогам гэтаму з'яўляецца мацнеючая год ад года міжнародная салідарнасць працоўных.**

**ЛЕ КОНГ ХУНГ.**

# З КРЫНІЦ ЖЫВАТВОРЧЫХ

**Хто з нас не помніць першую студэнцкую вясну, калі ўжо па-сутнасці за плячыма цэлы вучэбны год, пазнана хараство студэнцкага калектывізму і адрэзаны ладны кавалак ад невычэрпнага караваю ведаў! Усё гэта так уплывае на унутраны свет студэнта! Не, яны не перастаюць быць менш гарэзлівымі і вясёлымі, але разам з тым становяцца больш задумлівымі і разважнымі. Як прыемна нам, выкладчыкам, у свой час перажыўшым гэтыя вёсны, назіраць за зменамі ў паводзінах і характарах студэнтаў, радавацца іх першым поспехам на цяжкім шляху змагання за веды!**

**Іменна такую першую вясну перажываюць студэнты філасофскага аддзялення гістфака. Аб кожным з іх толькі па накопленых назіраннях можна напісаць цэлы нарыс.**

**З першых лекцый і семінарскіх занятка́ў Анатоль Злотнікаў, выхадзец з рабочай сям'і, праявіў вялікую цікавасць да навукі. Адразу кінулася ў вочы, што гэты юнак прыйшоў ва універсітэт не для таго, каб стаць у чаргу за дыпломам, а за ведамі, вялікімі ведамі. Як не цяжна было, а грунтоўна вывучыў і заканспектаваў увесь «Капітал» Маркса. Цяпер Анатоль на семінарскіх занятках па палітэканоміі адчувае сябе ўпэўнена. Ну, а мне, як выкладчыку, прыемна бачыць тое, што студэнт так старанна вывучае творы Маркса. А нядаўна на навуковым гарызонце Анатоля з'явілася першая ластаўка. Самастойна ён напісаў цікавую працу па праблеме абсалютнай зямельнай рэнты і зрабіў змястоўны даклад на студэнцкай навуковай канферэнцыі.**

**Тое ж можна сказаць і пра Анатоля Тараса. Анатоль неяк пасталеў за вучэбны год. У першым семестры ён не вылучаўся асаблівай актыўнасцю. Але было прыкметна, што хлопец працуе, многа працуе і расце, хутка расце. Прыйшла першая экзаменацыйная сесія. Перад залікам я зачытаў спіс студэнтаў групы, якім выстаўляліся залікі без апытання. Назваў прозвішча і Тараса. Пачуўшы сваё імя, Тарас аж ускапіўся з месца і ў здзіўленні ўсклікнуў:**

**— Мне?**

**— Вам,—спакойна сказаў я.**

**І што ж, я не памыліўся. Цяпер Анатоль выступае на кожным семінары. У яго глыбокая і лагічная думка. Адчуваюцца трывалыя веды.**

**Неяк Анатоль мне сказаў: «А ведаеце, «Капітал» па-сапраўднаму захапляе, ён бярэ цябе неяк усяго». Як добра сказана! Што Анатоль моцна пасябраваў з марксізмам, гэта адчулі ўсе на універсітэцкай студэнцкай канферэнцыі, прысвечанай 150-годдзю з дня нараджэння К. Маркса і 98-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. Там студэнт зрабіў проста цудоўны даклад па аграрнай праблеме.**

**І асобна хочацца сказаць пра Свету Малажанаву. Света — студэнтка-завочніца. Але яна наведвае лекцыі і семінары разам са студэнтамі стацыянара і сваёй настойлівасцю, працавітасцю ўжо заслужыла быць залічанай на стацыянар. Калі быў створаны эканамічны навуковы гурток на філасофскім аддзяленні, Света падыйшла да мяне і спытала:**

**— А мне можна?**

**Якую ж узяць тэму? Я параіў паспрабаваць вывучыць марксаву тэорыю грошай і паглядзець, як яна адлюстроўваецца ў мастацкай літаратуры. Тэма Свеце вельмі спадабалася. З зайздроснай стараннасцю ўзялася яна за працу. Праштудыравала вялікую колькасць спецыяльнай і мастацкай літаратуры. І вось першы поспех. Яе даклад на навуковай канферэнцыі атрымаў станоўчую ацэнку.**

**Сёння прыемна павіншаваць юных марксістаў з Маем, першай студэнцкай і навуковай вясной.**

**У. КУЛАЖАНКА,**
**кандыдат эканамічных навук, в. а. дацэнта.**

*ЗДАЕЦЦА, зусім нядаўна прыйшло новае папаўненне на падрыхтоўчы факультэт. Але за гэты час большасць студэнтаў з братняга В'етнама нядрэнна авалодала рускай мовай. У час самастойнай працы яны рыхтуюць вусныя расказы па выбраных тэмах. Вось і на гэтым здымку (справа) вы бачыце аднаго са студэнтаў—Нго Кам Ту, які вядзе гутарку на рускай мове.*

*ВОСЬ і надыходзіць 1 Мая, а разам з ім клопаты аб будучай сесіі. Дарэчы, у некаторых групах яна ўжо пачалася. Наш карэспандэнт І. Аскірка зазняў выкладчыка С. А. Малевіча ў час прыёму экзамена па асновах навуковага атэізму на трэцім курсе вячэрняга аддзялення юрыдычнага факультэта. Адказвае Уладзімір Пермінаў (унізе).*





# *Літаратурная старонка*

*У нашай першамайскай падборцы ёсць і дэбютанты. Упершыню мы друкуем вершы Валянціны Колтун, Фёдара Бандаровіча, Васіля Шырко. У добры час вам, сябры!*

# ЗА ЦІХІМ СОНЦА ЗВОНАМ

*ЮРКА ГОЛУБ*

## ДАЖДЖЫ СВЯТЛЕЮЦЬ, ЯК САДЫ

**Зноў галубіныя веранды.**
**Дажджы святлеюць, як сады.**
**Дваццаты год.**
**Ужо не рана.**
**Са мной, развага, пасядзі.**

**Жыццё раскладзена на трэці.**
**Адна. Яшчэ... Яшчэ адна.**
**Хачу старонкі перагрэсці,**
**Дзе жылка кожная відна.**

**Што зроблена —**
**не перакрэсліць,**
**Не разламаць, як футарал.**
**І пада мной трывае крэсла,**
**Як кроквы дзесь на хутарах.**

**І, заміраючы крывінкай,**
**Блукае думка сярод слоў.**
**А вы душой не пакрывілі!**
**Не праклінапі рамяство!...**

**Павекі цяжкія ў века,**
**Бяссоння доўгія брады.**
**Мой век —**
**Мой скарб,**
**Ўзнімаю века**
**Тваёй схаванай дабраты.**

*ВАЛЯНЦІНА КОЛТУН*

## ВАРЫАЦЫІ

Вясна. Вясна. Прыйшла,
як мацярынства.
І забалелі рукі ў мяне.
Бо пальцы ўжо даўно,
яшчэ з дзяцінства,
Нібы пупышкі, ныюць
па вясне.
І сэрца забалела неяк
дзіўна,
Бы нейкі боль лісцвяны
ў ім узнік
У час, калі
распростваюцца ліўні,
І крык дажджоў, нібы
дзіцячы крык.

* * *

О, што знайсці
і што аддаць,
Каб быць тваёю
хваляй шэрай,
Каб вечарам туман
кідаць,
Як сеці тонкія, на бераг.
Каб стаць глыбінню
той ракі,
Дзе на густых і важкіх
хвалях
Плывуць гады, нібы
вянкі,
Што ўюць дзяўчаты
на Купалле.

* * *

А шчасце —
край нашчадкаў тых
плямён,
Што пчол разводзілі
здаўна і слалі лён,
Што неруш пушчы
песняй зберaглі,
А нам, як дар,
натхнёнасць аддалі.
А шчасце —
край паэтаў і лясоў,
Дзе ў плеценыя кошыкі
радкоў
Збіраем словы дзіўныя,
нібы
З-пад росных сосдаў
першыя грыбы.

*ВАСІЛЬ ШЫРКО*

## НАЧНЫЯ СНЫ

Маўчаць гуллівыя трамваі.
Ледзь баюць нешта
праўды.
Здаецца,
вуліца ўздыхае
У трывозе чуйнай
драматы.
І бачыць —
ранак ажывае,
Страсае буйную расу.
Яшчэ заспаныя трамваі
Вясёлку зыркую вязуць.
Не першы сон глядзяць
мінчане.
Усход заняўся крамянецъ.
Машыны,
спуджаныя раннем,
Лятуць,
нясуцца праз мяне.

## ПІСЬМО ВЯРНУЛАСЯ

Сынок старэйшы,
самы смелы,
І слова ў голас
не сказаў.
У кут зашыўся,
спахмурнелы,
Як боб, скацілася сляза.
Міргала лямпа слепавата,
І марка сіняя жаўцела.
Пісьмо вярнулася
без таты,
Хоць адшукаць яго
хацела.

*Першы раз прыехаў у Беларусь вядомы паэт, якога вельмі любіць і паважае моладзь, Эдуард Асадаў. Многія студэнты універсітэта былі на выступленнях жаданага госця. А цяпер яны з'яўляюцца ўладальнікамі яго аўтографаў.*
*Фота І. АСКІРКІ.*



## А ВЫШЫНЯ — НЕ АХАПІЦЬ

*А вышыня—не ахапіць,—*
*Як неба, што было*
*ў дзяцінстве.*
*За гарызонт, дзе сонца спіць,*
*Завуць спрадвечныя*
*дзядзінцы.*

*Тут руціць кожнаму змала*
*Пайсці за ціхім сонца*
*звонам,*
*Адчуць, як дыхае зямля*
*Празрыстым сонечным*
*азонам.*

*ФЁДАР БАНДАРОВІЧ*

*Чубы зялёныя бароў*
*Плывуць, схаваныя у хмары.*
*І лісце маладых бяроз,*
*Як ветразь незвычайнай*
*мары.*

* * *

*М. БАГДАНОВІЧУ*

*Зязюля, марай шэракрылай*
*Ляці праз пожні і сады,*
*Спяшай, спяшай на бераг*
*Крыма,*
*Кувай, кувай яму гады!*

*О, беларускія крыніцы,*
*Не дапусціце вы бяды—*
*Нясі зязюля, прычасціцца*
*Жывой, гаючае вады!..*

*СЯРГЕЙ ЗАКОННІКАЎ*

## ЛІРЫКА

**1**

**А я іду праз выган**
**па ўзмежку,**
**І сэрца сонцам свеціць**
**у грудзях...**
**Пад хусткамі хаваючы**
**усмешкі,**
**Жанчыны ўслед паблажліва**
**глядзяць.**
**Шпакі на клёны ападаюць**
**ліўнем,**
**Калышуцца на правадах**
**галін.**
**Цераз платы, як пена,**
**пахіліўся**
**На вуліцу дурманячы язмін.**
**А на гары мяне чакае сена—**
**Цудоўная, духмяная пасцель.**
**Вароты зарыпелі і аселі,**
**Нібыта птушкі крыламі,**
**з пяцель.**
**Вось неба палыхнула**
**зараніцай,**
**І ў вусны промень птушанём**
**дзяўбе.**
**Я ведаю, што ты мне**
**будзеш сніцца—**
**І ад цябе іду, нібы к табе.**

**2**

**Пілавінне, як сняжынкі,**
**ветрам**
**Гоніць цераз вуліцу у роў.**
**Некаму цяпер ківаць**
**прыветна**
**і кідаць мне ў фортку**
**снегіроў.**
**Некаму дарыць світальных**
**спеваў,**
**Шумам лісцяў весяліць**
**душу.**
**Пад маім акном забілі**
**дрэва,—**
**Вершаў сёння я не напішу.**

*АНАТОЛЬ КАЗЛОВІЧ*

## МАЦІ

Я люблю нечакана
дамоў з'явіцца...
Мне доўга не хочацца
вокны будзіць,
За імі так хараша
маці спіцца...
Я сяджу і слухаю.
Слухаю.
Маладзік
Паступова бляднее...
Раптам —
У хаце скрып масніц!
Маці на вуліцу
белым світаннем ляціць!
Сынок!
А я чакала!
Прадчувала.
Не спала...

*ГЕНАДЗЬ ПАШКОЎ*

## МЛЫН

Дзедам старым
На ўзгорку млын
Кашляе —
грудзі застуджаны.
А вечарам сонца
хаваецца ў ім
І вецер начуе ў крылах
натруджаных.
Ледзь зварухнецца —
скрыпіць млын
адчайна.
Спрабуе ўвысь падняцца.
Дзівак!
Не змог у век паравы.
Нашто ж
у атамны парывацца?!..



**ПЕРАД НАВАЛЬНІЦАЙ.** Фота **С. Супруна.**

*ВІКТАР ЯРАЦ*

## У МОРЫ ЗЕЛЯНІНЫ

**Я анямеў у моры зеляніны.**
**Я страціў слых у цішыні**
**густой.**
**Паўсюль — травы, кустоў**
**і дрэў разлівы**
**Гайдаюцца між небам**
**і зямлёй.**

**Застаўся ззаду пыл дарог**
**далёкіх**
**І сцежак, што вялі мяне**
**сюды,**
**Дзе дыхаць у далінах**
**летніх лёгка,**
**Дзе спяць на золку**
**ў туманах сады.**

**Дзе у лугах, як**
**на пасцелях хмельных,**
**Ты можаш спаць,**
**забыўшыся пра усё,**
**І сніць вышыні сосен**
**карабельных,**
**І сніць дарогі ў новае**
**жыццё...**

*МАР'ЯН ДУКСА*

## СТУДЭНЦКІ ПАДАКОННІК

Як табурэтка, пашарпаны—
Яму зусім не да красы!
Карандашамі пакрамсаны—
Адны імёны і плюсы.

Зліліся надпісы старыя,
Іх нават чорт не разбярэ.
Не толькі іх санітарыя,
Але й праверка не сатрэ.

Бывалы хлопец і платонік,
На свежай простыні не спі,
А дэфіцытны падаконнік,
Пакуль не позна, захапі.

Прыходзь, сядай, чакай і
і думай,
І раўнасць выцягні да дна,
Пакуль усмешкай і
парфумай
Напомніць пра сябе яна.

Яна у кофтачцы ажурнай
Перад табою расцвіла.
Ды будзе вас пужаць
дзяжурны
Зноў дэкарацыяй святла.

Пара адмовіцца ад казак.
А час — дай бог яму! —
ляціць.
Паказытаўшы нервы, тазік
Ужо на кухні тарахціць.

Душа пакрыўджана бастуе,
І сэрцы бедныя злуюць,
Што цалавацца уадкрытую,
Як у Парыжы, не даюць.

Прымі вітанне, змрок
паўночны!
Адтарахцела, адгула.
І застаюцца толькі вочы
І губ паўдзённае цяпло.

Бывай, Гамер! Апальны
Дантэ,
У ленпакоі адпачынь.
Даўно ўжо рукі
дыпламантаў
У першакурсніц на плячы.

І будзе соладка і горка,
І будзе радасна да слёз,
І будзе стукацца з падворку
Трыццаціградусны мароз.

І будуць пісьмы,
тэлеграмы
Складацца самі у ваччу:
«Я без канца чытаю, мама,
Амаль без памяці вучу...»

А заўтра не зусім тактычна
Ад ганаровага імя
Табе заявяць на
практычных,
Што сёння ты ні бэ ні мя...

І стане страшна і балесна,
Калі пагрозліва ў набат
Ударыць, нібы гром
нябесны,

Назаўтра строгі дэканат.
Прасі у маці суцяшэння
І сынам стань,
забудзь, што франт,
Калі загад аб высяленні
Падстроіць бойкі
камендант.

Хоць лёс паставіць двойку
ў дзённік
І памаркоцішся тры дні,
Ты свой студэнцкі
падаконнік
Ні ў якім разе не кляні.

Хоць будзеш ты вялікі
цынік,
Адкрыеш «ісціну» даўно:
«Каханне сцёрта, як
паўцінік
Цара Гароха», — усё адно.

Прыходзь, сядай, чакай і
думай
І п'яным будзь, як ад віна,
Калі усмешкай і парфумай
Напомніць аб сабе яна.

**Адказны рэдактар М. ІОСЬКА.**

АТ 02178 Зак 690 **Наш адрас: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда».**